Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 ЛІПЕНЯ 2017 г. АЎТОРАК №130 (28494)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ



**«Шашачкі» больш не патрэбныя**



**Як мурманчанкам жывецца ў Мінску**



**На імяніны да Мастака**

СТАР. 13

*ЛІЧБА ДНЯ*

**9 505 тыс. чалавек**

*склала колькасць насельніцтва Беларусі на пачатак гэтага года. Па гэтым паказчыку Беларусь займае 92-е месца ў свеце, 17-е месца сярод еўрапейскіх дзяржаў, шостае месца сярод краін СНД, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. На пачатак гэтага года ў Беларусі налічвалася 5 078 тыс. жанчын і 4 427 тыс. мужчын. На 1000 мужчын прыпадала 1147 жанчын, у тым ліку ў гарадской мясцовасці — 1168, у сельскай мясцовасці — 1078 жанчын. Самым шматлікім па колькасці жыхароў з'яўляецца Мінск — у сталіцы жыве 1 975 тыс. чалавек, або кожны пяты жыхар краіны (20,8%). Сярод абласцей найбольш заселены Мінская і Гомельская, самым маленькім сярод гарадоў па колькасці з'яўляецца Дзісна ў Віцебскай вобласці (1,5 тыс. чалавек).*

Курсы замежных валют, устаноўлены НБ РБ з 11.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9734 | ▲ |
| Еўра | 2,2504 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0759 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Дзе нарадзіўся, там і згадзіўся, і дапамог

## Фестываль у Александрыі сабраў амаль сто тысяч чалавек

**Такую колькасць людзей на адным мерапрыемстве складана сустрэць нават у сталіцы. У мінулую суботу ў Александрыю Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці няспынннай плынню сцякаліся жыхары з усіх рэгіёнаў краіны. Іх сабралася амаль сто тысяч. Гандаль ішоў на ўра, госці елі і пілі, а ўвечары ўпадабалі святочны феерверк і канцэрт, хоць і на працягу дня спевы і танцы не спыняліся.**





Фота БЕЛТА.

На адмысловых «вуліцах» свята «Александрыя збірае сяброў» немагчыма спакойна прайсціся. На адной — спяваюць, на другой — танцуюць, на трэцяй — гуляюць у беларускія народныя гульні. Удзельніцы народнага ансамбля «Медуніца» з Магілёўскай вобласці клічуць прахожых згуляць з імі. За канцы двух паясоў, складзеных крыж-накрыж, трымаюцца чатыры жанчыны. На лік тры — пачынаюць закручвацца да цэнтра. Што, як высветлілася, не так проста. Згуляўшы тры разы, ад душы насмяяўшыся, я зразумела, што «круціцца» трэба ўмець не толькі па жыцці...

Ды і купальскія вяночкі на свяце плялі амаль усе. Жанчыны ахвотна апраналі кветкавыя ўборы з натуральных раслін і хадзілі ў іх увесь дзень. «Матэрыял нарыхтоўваем самі: валошкі, рамонкі, зверабой, лён, жыта, галіны бярозы», — расказвае Валянціна Паўлюк, навуковы супрацоўнік Дома рамёстваў вёскі Кароўчына Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці, якую мы заспелі акурат за пляценнем. Але брэндам гэтага Дома рамёстваў сталі лапці. Бо тут першымі аднавілі амаль згубленае рамяство іх пляцення. Дарэчы, тэхналогія пляцення дрыбінскіх лапцей атрымала статус гісторыка-культурнай спадчыны. Іх можна было пабачыць тут жа.

СТАР. 2

■ Ведай нашых!

# ЁН АДЗІН ТАКІ

## Уладзімір Самсонаў стаў аўтарам унікальнага дасягнення

**Легендарны беларус выйграў Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі па настольным тэнісе, у фінальным паядынку мужчынскага адзіночнага разраду з лікам 4:1 ён абыграў француза Сімона Газі. Гэтая перамога не толькі прынесла Уладзіміру тытул чэмпіёна, але і дазволіла стаць уладальнікам унікальнага дасягнення — цяпер Самсонаў адзіны ў свеце гулец, які выйграваў турніры сусветнай серыі на ўсіх пяці кантынентах: у Афрыцы, Амерыцы, Азіі, Еўропе і Аўстраліі.**



У 41 год беларус стаў пераможцам на турніры сусветнага тура з самым вялікім прызавым фондам — 400 тысяч долараў. Для Газі гэтая гульня таксама была асаблівай, бо ён яшчэ ні разу не перамагаў на чэмпіянатах сусветнай серыі ў адзіночным разрадзе. Усё вырашыў вопыт і псіхалогія, лідар беларускай зборнай заваяваў першы свой трафей у сезоне, цяпер Самсонаў дакладна ўвойдзе ў дзясятку сусветнага рэйтынгу. Акрамя таго, тытул чэмпіёна Аўстраліі стаў для 41-гадовага беларуса рэкордным у сусветным настольным тэнісе — 27-м!

Нагадаем, экс-першая ракетка свету Уладзімір Самсонаў — трохразовы пераможца Кубка свету (1999, 2001, 2009). 6-разовы чэмпіён Еўропы ў розных разрадах. 4-разовы пераможца «Еўра-Топ 12» (1998, 1999, 2001, 2007). 9-разовы пераможца еўрапейскай Лігі чэмпіёнаў. Удзельнік шасці Алімпіяд.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

■ Ёсць пытанне

# ДЗЕ НА ВЁСЦЫ КПП?

## Як вярнуць у правінцыю сферу паслуг



**У Камітэце дзяржкантролю Гродзенскай вобласці канстатуюць: жыхары сельскіх населеных пунктаў скардзяцца на адсутнасць некаторых бытавых паслуг. У шэрагу раёнаў замест 10 прыёмных пунктаў працуе некалькі.**

Так, у Воранаўскім раёне цяжка знайсці цырульніка, здаць рэчы ў хімчыстку і пральню. Сёлета раённае прадпрыемства бытавога абслугоўвання перастала існаваць, а прыватны сектар у гэтым кірунку развіваецца марудна. За гэты час зарэгістраваны адзін прадпрымальнік па рытуальных паслугах і адно прадпрыемства — лазня. Нават у райцэнтры немагчыма здаць бялізну ў пральню ці хімчыстку. Спадзявацца на адраджэнне былога камбіната наўрад ці варта, бо ў прадпрыемства дагэтуль вісіць пазыка ў памеры 50 тыс. рублёў.

У Шчучынскім раёне камбінат бытавога абслугоўвання не закрылі, затое рэарганізавалі. У выніку — трэцяя частка прыёмных пунктаў на вёсках знікла. Зараз на ўвесь раён засталося толькі тры з дзесяці. Прадпрымальнікі гэту нішу таксама не спяшаюцца заняць — на арандаваных плошчах былых комплексных прыёмных пунктаў (КПП) ажыццяўляюць толькі частку заяўленых паслуг.

СТАР. 13